МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

ІМЯ П.М. МАШЭРАВА»

Факультэт гістарычны

Кафедра гісторыі Беларусі

Дапушчана да абароны

«09» 02 2017 г.

Загадчык кафедры

А.М. Дулаў

МАГІСТАРСКАЯ ДЫСЕРТАЦЫЯ

# ФАРМІРАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАГА РЭЛЬЕФА І ТЭРЫТОРЫІ Г. ВІЦЕБСКА (ПАЧАТАК І ТЫС. – ХХІ СТ.)

Спецыяльнасць 1–21 80 16 “Айчынная гісторыя”

**Пятрэнка Наталля Аляксандраўна,**

магістрант

Навуковы кіраўнік:

**Юрчак Дзяніс Валер’евіч,**

кандыдат гістарычных навук.

Віцебск, 2017

**Рэферат**

Магістарская дысертацыя 68 с., 48 мал., 7 табл., 72 крыніцы.

ГІСТАРЫЧНЫ РЭЛЬЕФ, ТЭРЫТОРЫЯ ГОРАДА, АРХІТЭКТУРНЫЯ ДАМІНАНТЫ, ПЛАНІРОВАЧНАЯ СІСТЭМА, ГОРАДАБУДАЎНІЦТВА.

**Аб'ект даследавання**– гістарычны рэльеф і тэрыторыя г. Віцебска.

**Прадмет даследавання**– працэс станаўлення і развіцця гістарычных частак нашага роднага горада.

**Мэта работы:** асвятліць працэс фарміравання гістарычнага рэльефа г. Віцебска (пачатак I тыс. – XXI ст.)

**Метады даследавання:** кантэнт–аналіз шырокага кола археалагічных, гістарычных і картаграфічных крыніц, параўнальна–супастаўляльнае даследаванне архіўных дадзеных.

**Элементы навізны:** прадстаўленая магістарская дысертацыя з‘яўляецца абагульняючым і сістэматызуючым даследаваннем па пытаннях фарміравання гістарычнага рэльефа і тэрыторыі г.Віцебска ў розныя гістарычныя перыяды.

**Вынікі ўкаранення:** распрацоўка выкарыстоўвалася ў навуковым і выхаваўчым працэсе ДУА “Сярэдняя школа №24 г.Віцебска”. Па тэме дысертацыі праводзіліся навуковыя даследаванні вучняў школы, якія прымалі ўдзел у навукова–практычных канферэнцыях раённага, гарадскога, абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў.

**Тэарэтычная і практычная значнасць даследавання:** сабраны і абагульнены матэрыял, па пытанню развіцця гістарычнага рэльефа і тэрыторыі Віцебска ў вывучаемы гістарычны перыяд, можа быць выкарыстаны ў якасці лекцый па гісторыі, геаграфіі і краязнаўству, правядзення семінараў, спецкурсаў, экскурсій, а таксама выдання эксурсійных буклетаў.

## ЗМЕСТ

Уводзіны……………………………………………………………………………4

ГЛАВА 1. ФАРМІРАВАНННЕ ГІСТАРЫЧНАГА РЭЛЬЕФА І ТЭРЫТОРЫІ Г.ВІЦЕБСКА (ПАЧАТАК І ТЫС. – XVIII СТ.)……………………………………………………11

1.1. Перыяд першапачатковага фарміравання гістарычнага рэльефа і тэрыторыі г.Віцебска ад засялення да XIII ст……………………………………………11

1.2. Развіццё мураваных замкавых комплексаў і слабодаў на тэрыторыі г.Віцебска ў XIV– XVIII стст…………………………………………………20

ГЛАВА 2. ЭВАЛЮЦЫЯ ГІСТАРЫЧНАГА РЭЛЬЕФА І ТЭРЫТОРЫІ Г.ВІЦЕБСКА (XVIII– ПАЧАТАК XXI СТСТ.)……………………………………………………33

1.1. Асаблівасці развіцця тэрыторыі і планіровачнай сістэмы г.Віцебска з 1772 г. да 1917 г……………………………………………………………33

1.2. Перыяд развіцця горадабудаўніцтва і роста тэрыторыі ад Кастрычніцкай рэвалюцыі да XXI ст………………………………………………………45

Заключэнне…………………………………………………………………………60

Спіс выкарыстаных крыніц………………………………………………………64

Дадаткі……………………………………………………………………………69

## Уводзіны

На сучасным этапе развіцця айчыннай гістарычнай навукі назіраюцца тэндэнцыі актыўнага вывучэння лакальнай гісторыі. Гарадская тэматыка заўсёды выклікала цікавасць даследчыкаў і ў апошні час урбаністыка стала аб'ектам асабліва пільнай увагі беларускіх гісторыкаў. Вельмі актуальнай з'яўляецца гісторыя асобных гарадоў, і адзін з іх– Віцебск. Менавіта таму, кірункам нашай дзейнасці з'яўляецца дэталёвае вывучэнне фарміравання гістарычнага рэльефа і тэрыторыі свайго роднага горада.

**Актуальнасць** тэмы нашай работы заключаецца ў тым, што вывучэнне лакальнай гісторыі дапамагае ў поўным аб'ёме зразумець гістарычныя працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі ўсёй краіны ў цэлым. Дадзеная тэматыка застаецца прывабнай яшчэ і таму, што патрабуе глыбокага даследавання і сістэматызацыі. Вывучэнне гістарычнага рэльефа і роста тэрыторыі Віцебска, будзе ствараць умовы для больш дасканалага асэнсавання гістарычнага мінулага і развіцця краязнаўчага кругагляду.

Зыходзячы з актуальнасці, навуковай значнасці вывучаемай праблемы, пастаўлена **мэта**: асвятліць працэс фарміравання гістарычнага рэльефа і тэрыторыі горада Віцебска (I тыс. – пачатак XXI ст.).

Дасягненне вызначанай мэты прадугледжвае рашэнне наступных даследчых **задач**:

- Прасачыць асаблівасці фарміравання і развіцця гістарычнага рэльефа і тэрыторыі горада Віцебска з I тыс. да XVIII ст.
- Прааналізаваць асноўныя падзеі і перабудовы, якія адбываліся на тэрыторыі горада Віцебска з XVIII ст. да пачатка XXI ст.

Галоўным **аб'ектам** нашага даследавання з'яўляецца гістарычны рэльеф і тэрыторыя Віцебска. **Прадметам** – працэс станаўлення і развіцця гістарычных частак нашага роднага горада.

У даследаванні рэалізуюцца сістэмны, комплексны, гістарычны падыходы, якія і ўяўляюць яго метадалагічныя прынцыпы. У працэсе навуковай работы над дысертацыйным даследаваннем выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя **метады** даследавання, так і спецыяльна–гістарычныя. Да першых адносяцца аналіз, сінтэз, індукцыя і дэдукцыя. Сярод спецыяльна–гістарычных метадаў выкарыстоўваліся гісторыка–параўнальны, гісторыка–статыстычны, гісторыка–сістэмны, гісторыка–тыпалагічны метады. Варта адзначыць і кантэнт–аналіз шырокага кола археалагічных,

гістарычных і картаграфічных крыніц, параўнальна–супастаўляльнае даследаванне архіўных дадзеных. Даследаванне грунтуецца на прынцыпах навуковасці, гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнасці.

**Навуковая навізна даследавання**: упершыню ажыццяўляецца абагульнены аналіз фарміравання гістарычнага рэльефа і тэрыторыі г.Віцебска ў розныя гістарычныя перыяды. Практычная значнасць даследавання заключаецца ў тым, што сабраны і абагульнены матэрыял па пытанню развіцця гістарычнага ральефа і тэрыторыі Віцебска ў вывучаемы гістарычны перыяд можа быць выкарыстаны ў якасці лекцый па гісторыі, геаграфіі і краязнаўству, а таксама для правядзення семінараў, спецкурсаў. Дадзеная работа можа выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы да правядзення экскурсій па Віцебску, выдання эксурсійных буклетаў, а таксама на занятках, прысвечаных гісторыі роднага горада.

**Гістарыяграфія** Віцебскага рэгіёна прадстаўлена шырокім колам публікацый розных аўтараў, што дае магчымасць разглядзець станаўленне Віцебска на працягу ўсяго часу існавання. Дарэвалюцыйная літаратура, прысвечаная Віцебску, прадстаўлена даследаваннямі, аўтарамі якіх з'яўляліся мясцовыя краязнаўцы, гісторыкі і чыноўнікі, якія займалі пасады ў розных установах горада. Асаблівую рою ў даследаванні мелі работы А.П. Сапунова, А.М. Сямянтоўскага, М.Я. Нікіфароўскага [55,58,42]. Іх даследаванні вылучаюцца багатым факталагічным матэрыялам і вялікім аб'ёмам статыстычных дадзеных. Яны займаюць прамежкавае становішча паміж крыніцай і гістарычным даследаваннем.

Важнае месца ў даследаванні займае работа А.П Сапунова— зборнік «Віцебская даўніна», выдадзены ў 1883—1888 гг. Вывучаючы гісторыю, літаратуру, археалогію, археаграфію, архітэктуру, фальклор Віцебска, А.П. Сапуноў выявіў і зрабіў палеаграфічныя апісанні рукапісных помнікаў і сабраў дакумэнты XI—XIX стст. [55].

А.М. Семянтоўскі — укладальнік і рэдактар васьмі тамоў памятных кніжак Віцебскай губерні (1863–1867, 1869, 1878, 1881 гг.). У кола тэм даследавання ўваходзілі: гісторыя Віцебскай губерні, яе археалогія, статыстыка тагачаснай Віцебшчыны і статыстыка мінулых гадоў, развіццё народнай адукацыі і прамысловасці, клімат, геалогія і карысныя выкапні, этнаграфія, статыстыка за розныя гады [44, 58].

М.Я. Нікіфароўскі ў рабоце "Странички из недавней старины города Витебска" пакінуў багатую спадчыну па этнаграфічнаму вывучэнню Віцебшчыны. Асноўную ўвагу

даследчык надаваў становішчу розных груп насельніцтва Віцебшчыны, даследаванню матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці беларусаў XIX ст. [42].

У пасляваенны перыяд працягнулася даследаванне гісторыі Віцебска ў работах Л.В. Аляксеева, прысвечаных Полацкай зямлі, а таксама навуковым артыкуле ”К истории и топографии древнейшего Витебска” [1]. У манаграфіі Г.А. Нікіціна “Віцебск”, выдадзенай у 1959 г., знаходзяцца сведкі па гісторыі тэрыторытарыяльных перабудоў горада ў розныя гстарычныя перыяды [43]. Асобна трэба адзначыць работу Т.І. Чарняўскай “Архітэктура Віцебска. З гісторыі планіроўкі і забудовы горада”, якая была выдадзена ў 1980 г., дзе даецца разгорнуты агляд гісторыі горада і асвятляецца працэс развіцця планіроўкі Віцебска, а таксама працэсы тэрытарыяльных перабудоў [64].

Каштоўныя звесткі дадзенных археалогіі былі знойдзены ў рабоце Г.У. Штыхава “Города Полоцкой земли (IX—XIII вв.)” [67]. У даследаванні 1984 г. В.М. Ляўко “Витебск XIV–XVIII вв.” Раскрываецца працэс фарміравання, развіцця і функцыянавання Віцебска як адміністрацыйна–кіраўнічага цэнтра акругі ў сістэме раннедзяржаўных структур, а таксама апісваюцца археалагічныя даследаванні, тапаграфія і планіроўка горада[40].

Аснову планіроўкі раннесярэднявечнага Віцебска, разглядае археолаг Л.У. Калядзінскі ў артыкуле “Сярэдневечны Віцебск як эталонный помнік матэрыяльнай культуры Беларускага феадальнага горада” [35]. Наш родны горад быў падрабязна вывучаны ў 1980–ыя гг. у работах М.А. Ткачова “Раскопкі на Верхнім замку” і “Замкі Беларусі” [61]. Даследаванні дазволілі ўбачыць і зразумець сапраўднае жыццё продкаў, іх побыт, іх звычаі і традыцыі, шляхі фармавання тэрыторыі замкаў і развіцця тапаграфіі.

Шмат інфармацыі знойдзена ў энцыклапедычным даведніку, які быў выдадзены ў 1988 г. аўтарам складальнікам І.П. Шамякіным. Энцыклапедычны даведнік уключае больш за 100 артыкулаў пра гісторыю і помнікі архітэктуры Віцебска [17]. Увагі патрабуе і гісторыка–дакументальная хроніка "Памяць" (укладальнік А.І. Мацяюн), дзе падрабязна распавядаецца пра гісторыю Віцебска, знакамітых людзях, якія нарадзіліся і жылі тут [49].

У рабоце Ю.Н. Кішыка “Панарама старога Віцебска” на аснове старажытных планаў і акварэлей Іосіфа Пешкі ўзнаўляецца архітэктурнае аблічча горада, а менавіта яго планіроўка і забудова канца XVIII– пачатку XIX стст. [36].

У манаграфіі, выдадзенай у 2004 г., Т.С. Бубенька аб даследаванні Віцебска X– першай паловы XIV стст., можна знайсці інфармацыю аб фарміраванні тэрыторы гандлёва–рамеснага пасада, забудове і планіроўцы, прасачыць характарыстыку і

храналогію эканамічнага развіцця пасада [12]. У манаграфіі 2010 г. В.М. Ляўко "Витебск: Древние города Беларуси", раскрываюцца старажытныя старонкі яго гісторыі. Адбываецца апісанне зараджэння горада, яго станаўлення і развіцця, даецца тлумачэнне шэрагу гістарычных падзей і ацэнка гаспадарча–эканамічнага, культурнага значэння горада на розных этапах эпохі сярэднявечча і ранняга новага часу [39].

У манаграфіі У.А. Русецкага і Ю.У. Русецкага "Архитектура и градостроительство в художественной культуре Витебщины с 1918 г. до наших дней" упершыню ў гісторыі мастацкай культуры Віцебшчыны зроблена спроба сістэмна даследаваць працэсы станаўлення новай архітэктуры і горадабудаўніцтва [54].

Шмат патрэбнай навуковай інфармацыі было знойдзена ў энцыклапедыях: Археалогія і нумізматыка Беларусі, Археалогія Беларусі, Беларуская энцыклапедыя, Энцыклапедыя ВКЛ і інш. [2, 3, 4, 5]. Вельмі важную ролю ў даследаванні мелі і праверaныя навуковыя артыкулы з інтэрнэт–рэсурсаў, напрыклад "Віцебская энцыклапедыя" [17]. На сучасным этапе Віцебск працягвае заставацца аб'ектам вывучэння з боку гісторыкаў і мясцовых краязнаўцаў.

**Летапісы і хронікі.** Шэраг звестак аб гісторыі старажытнага Віцебска паведамляецца ў так званым Віцебскім летапісе Панцырнага і Аверкі, які складаўся прыкладна з сярэдзіны XVII ст. і быў завершаны ў 1768 г. [52]. Пра Віцебск узгадваецца і ў Маскоўскім летапісным зборы, у старажытным так званым "Сафійскім летапісе" і "Аповесці мінулых часоў"[52]. У летапісы Быхаўца XVI–XVII стст. згадваюцца віцебскія князі з пачатку XI ст. Цікавыя звесткі пра віцебскія замкі, тапаграфію і планіроўку горада знаходзіцца ў хроніках А. Гваніні і М. Стрыйкоўскага [71]. Работы А.П. Сапунова, А.М. Сямянтоўскага, М.Я. Нікіфароўскага займаюць прамежкавае становішча паміж крыніцай і гістарычным даследаваннем [55,58,42].

**Матэрыялы справаводства.** Значнае месца ў вывучэнні гісторыі горада займаюць архіўныя матэрыялы, якія знаходзяцца ў фондах Віцебскага архіва. У фондзе 907 знаходзіцца калекцыя картаграфічных матэрыялаў і праектнай прадукцыі за 1784–1980 гг.: планы ўмацаванняў г. Віцебска, этнаграфічная карта Віцебскай губерні, ваенна–тапаграфічная карта Паўночна–Заходняй часткі Расіі, карты Віцебскай губерні, Планы зямельных участкаў па Віцебскаму павету, карты і планы г.Віцебска [22, 23, 24]. У фондзе 4088– камунальнага ўнітарнага прадпрыемства, знаходзяцца матэрыялы па капітальнаму будаўніцтву г.Віцебска за 1959–2008 гг.: загады і планы капітальнага будаўніцтва, анкеты

аб аб'ектах няскончанага будаўніцтва, перапіска аб рэканструкцыі летняга амфітэатра [30]. У фондзе 1511– упраўлення капітальнага будаўніцтва Віцебска вытрымліваюцца матэрыялы за 1972–2007 гг.: планы работы, пяцігадовыя планы капітальнага будаўніцтва, справаздачы аб выкананні, акты прыёмкі ў эксплуатацыю аб'ектаў, перапіска [25, 26]. У фондзе 1604– камітэта па будаўніцтву і архітэктуры Віцебскага аблвыканкама знаходзяцца матэрыялы за 1965–2006 гг.: загады Дзяржаўнага камітэта па справах будаўніцтва, дакументы па капітальнаму будаўніцтву, рэканструкцыі, аб зацвярджэнні праектна–сметнай дакументацыі [27, 28, 29].

**Выяўленча–графічныя крыніцы** прадстаўлены шырокім колам картаграфічнага і схематычнага матэрыялу, фотаздымкамі, малюнкамі і інш. Асаблівую ролю ў рабоце мелі картаграфічныя матэрыялы: карты, планы, схемы, чарцяжы Віцебска і інш. [17]. З дапамогай карт мы ўбачылі размяшчэнне гістарычных аб'ектаў з такой дакладнасцю, якую нельга перадаць ні ў адным апісанні. Напрыклад, "Чарцёж Віцебска 1664 г."– гэта дакументальны помнік гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва. Выкарыстанне фатаграфій, гравюр і карт як гістарычных крыніц дазваляе пашырыць і дапоўніць гістарыяграфічныя і метадычныя магчымасці даследчыка [15].

Такім чынам, зыходзячы з разглядаемага матэрыла, па абранай праблематыцы маецца досыць разнастайны і шырокі гістарыяграфічны матэрыял. У даследаванні будзе ажыццяўляцца абагульнены аналіз фарміравання гістарычнага рэльефа і тэрыторыі горада Віцебска ў розныя гістарычныя перыяды.

**Асноўныя палажэнні магістарскай дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1) Археалагічныя даследаванні тэрыторыі горада Віцебска X–XIII стст. дазваляюць зрабіць выснову, што гістарычны рэльеф горада развіваўся пад уздзеяннем прыродна–ландшафтных умоў: пагорыстай мясцовасці сярод гідраграфічных аб'ектаў. Першаасновай горада з'яўлялася тэрыторыя левабярэжжа р.Віцьбы пры ўпадзенні яе ў р.Заходнюю Дзвіну. На гэтай тэрыторыі асноўнымі дамінантамі рэльефа выступалі Замкавая гара (Ламіха) і Дзвінскае ўзвышша, акрамя гэтага выдзяляецца і трэцяя дамінанта– Успенская (Лысая) гара, якая знаходзілася насупраць двух заселеных узвышшаў і стала месцам свяцілішча. Менавіта на аснове першых двух узвышшаў сфарміраваліся ўмацаваны дзяцінец і вакольны горад, дзе пазней узнікаюць драва–земляныя ўмацаванні Ніжняга і Верхняга замкаў.

2) Уздзеянне пагорыстага рэльефа мясцовасці горада Віцебска, становучa паўплывала на фарміраванне мураваных замкавых комплексаў Верхняга і Ніжняга замкаў з XIV ст. і Узгорскага замка з XVI ст. Менавіта характар падпарадкавання рэльефу мясцовасці быў асновай у фарміраванні выразнага сілуэта горада Усе тры замка былі цесна звязаныя паміж сабой планіровачнай і аб'ёмнай забудовай. У архітэктурным плане на тэрыторыі кожнага комплекса існавалі свае цэнтры і дамінанты, асабліва вылучаліся вежы замкаў і культавых пабудоў. Акрамя замкавых комплексаў існавалі Завіцебная, Заручаўская, Задунаўская, Узгорская, і Задзвінская слабоды (пасады), тэрыторыя якіх паступова ўваходзіла ў склад горада.

3) З разбурэннем абарончых умацаванняў, якія падзялялі горад на тры часткі, пачаў складвацца адзіны грамадска–культурны цэнтр. З канца XVIII ст. на развіццё гістарычнага рэльефа Віцебска аказалі ўплыў распрацоўкі і рэалізацыі новых планаў перабудовы горада. Галоўная задача якіх заключалася ў рэгуляванні планіровачнай структуры горада і яго забудовы, развіцці гістарычнай планіроўкі ў завершаную прасторава–гарадскую сістэму, дзе былі ўмела выкарыстаны і прыродныя ўмовы і ўжо сфармаваліся апорныя будынкі, у тым ліку існавалі дамінанты. З сярэдзіны XIX да пачатку XX стст., пад уплывам прамысловага і чыгуначнага развіцця, Віцебск з невялікага драўлянага гарадка ператварыўся ў буйны прамысловы і культурны цэнтр з пераразмеркаваннем гарадскіх кампазіцыйна–планіровачных восяў і складанай архітэктурна–планіровачнай структурай.

4) Пасля 1917 г. назіраўся значны рост прамысловасці і фарміраванне новых працоўных частак горада, якія пачалі хутка змяняць знешні воблік і гістарычны рэльеф горада. З'явілася шмат прамысловых прадпрыемстваў з шчыльнай забудовай навакольных раёнаў, пачалі развівацца шматпавярховыя і грамадскія будынкі, працягнулася развіццё і ўваход новых частак у склад горада. Асабліва змяніўся архітэктурны воблік горада у сувязі са стратай культавых аб’ектаў, якія былі дамінантамі рэльефа. Вялізныя страты гораду прынесла Вялікая Айчынная вайна. Паскоранае пасляваеннае аднаўленне Віцебска ў 1950–80–х гг., знайшло выраз у маштабным жыллёлевым будаўніцтве, з`яўленні новых мікрараёнаў. Паказана развіццё планіровачнай структуры горада ў пачатку XXI ст. і ўключэнне ў яго склад прыгарадных населенных пунктаў. Архітэктурнае аблічча Віцебска вылучаецца жыллёвым будаўніцтвам, а ў стварэнні новых ансамбляў цэнтра вядучая роля

належыць грамадскім будынкам. За апошні час значна павысіліся архітэктурна–будаўнічыя якасці гэтых пабудоў.

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі **апрабаваны на навуковых канферэнцыях:** II Міжнароднай навукова–практычнай канферэнцыі "Віцебскі край", прысвечанай 385–годдзю выхаду ў свет "Буквара" Спірыдона Собаля (Віцебск, Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, 24 лістапада 2016 г.).; IV Міжнароднай навукова–практычнай канферэнцыі "Актуальныя праблемы прафесійнай адукацыі ў Рэспубліке Беларусь і за мяжой" (Віцебск, Установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі міжнародны універсітэт "МІПСА" Віцебскі філіял, 16 снежня 2016 г.).

**Вынікі ўкаранення:** вынікі даследавання выкарыстоўвалася ў навуковым і выхаваўчым працэсе ДУА "Сярэдняя школа №24 г.Віцебска": у распрацоўках факультатыва "Краязнаўства", інавацыйным праекце "Музейная педагогіка", а таксама ў рабоце з адоранымі вучнямі. Што знайшло адлюстраванне ў падрыхтоўцы вучняў да навукова-даследчай дзейнасці па тэмах: "Масты і плошчы Віцебска", "Гісторыя мікраараёнаў школы", "Сем халмоў Віцебска", "Замкавая комплексы Віцебска". А таксама ў распрацоўках экскурсійных маршрутаў "Па мастам і плошчам горада", "Горад на сямі пагорках", "Гісторыя замкаў Віцебска". На падставе чаго вучні школы прымалі актыўны ўдзел у конкурсах і навукова-практычных канферэнцыях раённага, гарадскога, абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў.

**Апублікаванасць вынікаў:** палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў публікацыі ў зборніках матэрыялаў II Міжнароднай навукова–практычнай канферэнцыі "Віцебскі край", прысвечанай 385–годдзю выхаду ў свет "Буквара" Спірыдона Собаля і IV Міжнароднай навукова–практычнай канферэнцыі "Актуальныя праблемы прафесійнай адукацыі ў Рэспубліке Беларусь і за мяжой".

**Структура і аб'ём дысертацыі**: дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, асноўнай часткі, якая ўключае ў сябе 2 главы, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадаткаў.

## Спіс выкарыстыных крыніц


1. Алексеев, Л. В. Полоцкая земля в IX – XIII вв.: Очерки истории Северной Белоруссии / Л.В. Алексеев. – М.: Наука: АН СССР, Институт археологии, 1966. – 295 с.
2. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1 / Рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2009. – 496 с.
3. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 3. Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII стст.) / Я.Г. Звяруга, Т.М. Каробушкіна, П.Ф. Лысенка, Г.В. Штыхаў; Навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мн.: Бел. навука, 2000. – 554 с.
4. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV – XVIII стст. / В.М. Ляўко, М.Ф. Гурын, Ю.А. Заяц і інш.; Пад рэд. В.М. Ляўко і інш. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 597 с.
5. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя / Рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. — Мінск: БелЭн, 1993. — 702 с.
6. Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1993. — 620 с.
7. Без–Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся / М. О. Без–Корнилович. – СПб.: Въ типографіи Отд. Собст. Е. И. В. Канцеляріи., 1855. – 99 с.
8. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.4 / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў(гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1997. –. 480 с.
9. Беларускія летапісы і хронікі / уклад.У.А. Арлоў; рэд.В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 430 с.
10. Беленький, З. В. Витебск и окрестности: Справочник–путеводитель / З. В. Беленький, А. М. Подлипский. – Мн.: Полымя, 1984. – 112 с.
11. Брежго, Б. В. Замки Витебщины. / Б. В Брежго– Вильня: Типография Я. Левина, 1933. – 38 с.
12. Бубенько, Т.С. Средневековый Витебск: Посад – Нижний замок (X – первая половина XVI века) / Т.С. Бубенько. – Витебск: , 2004. – 276 с.
13. Витебская энциклопедия [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://evitebsk.com/wiki/. – Дата доступа: 20.12.2016.
14. Витебск: историко–экономический очерк / ред. коллегия В. П. Воробьева [и др.] ; фото: В. Гончаренко, М. Шмерлинг. — Минск : Наука и техника», 1974. – 224 с.

15. Витебск: План города / Редактор В. А. Змачинская, дизайн обложки С. А. Берестень. – Обновл. и дополн. в 2009 г. – Мн.: РУП "Белкартография", 2010. – 36 с.

16. Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф., прысвеч. 50–годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150–годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага, Віцебск / рэдкал. Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск: Медысонт, 2010. – 350 с.

17. Витебск: Энциклопедический справочник / Гл. редактор И. П. Шамякин. – Мн.: БелСЭ им. П. Бровки, 1988. – 408 с.

18. Военно–статистическое обозрение Российской Империи. Том VIII. Часть 1. Витебская губерния. / Санкт–Петербург: В типографии при 1–м отделении Департамента Генерального Штаба, 1852. – 220 с.

19. Вялікае княства Літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя: у 2 т. / Беларус. навук.–даслед. ін–т дакументазнаўства і арх. справы ; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2005–2006. – Т. 1. – 2005. – 684 с.

20. Гістарычна–дакументальная хроніка Віцебска/ Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2003. – 680 с.

21. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соврем. шк.: Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2007. – 344 с.

22. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф.907. Воп. 1. Спр. 5. – Арк 1.

23. ДАВВ. – Ф.907. Воп. 5. Спр. 1. – Арк 6.

24. ДАВВ. – Ф.907. Воп. 8. Спр. 1. – Арк 1.

25. ДАВВ. – Ф.1511. Воп. 1. Спр.90. – Арк. 13.

26. ДАВВ. – Ф.1511. Воп. 2. Спр. 40.– Арк. 128.

27. ДАВВ. – Ф.1604. Воп. 2. Спр. 41. – Арк.33.

28. ДАВВ. – Ф.1604. Воп. 3. Спр. 2. – Арк.6.

29. ДАВВ. – Ф.1604. Воп. 6. Спр. 28. – Арк. 225.

30. ДАВВ. – Ф.4068. Воп. 1. Спр. 5. – Арк. 135.

31. Егоров, Ю. В. Градостроительство Белоруссии / Ю.В. Егоров. – М., 1954. – 173–174 с.

32. Забелло, Л. А. История витебского трамвая / Л. А. Забелло – Витебск–1998: Витебское трамвайно–троллейбусное управление, 1998. – 129 с.

33. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР; Рэд. кал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш – Мн.: БелСЭ имени Петруся Бровки, 1985. – 496 с.

34. Калядзінскі, Л.У. Витебск три стены каменныя…// Гісторыя г.Віцебска ад часоў старажытнасці да пачатку XVIII ст. // Беларус. гіст. часопіс. –1995.–№2. 25– 44 с.

35. Калядзінскі, Л.У. Сярэдневечны Віцебск як эталонный помнік матэрыяльнай культуры Беларускага феадальнага горада.// Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў рэспубліцы Беларусь.Мн.: 1994.– 44–65 с.

36. Кішык, Ю.Н. Панарама старога Віцебска / Ю.Н. Кішык. – Мінск: Полымя , 1995.– 135 с.

37. Краснянскі, У.Г. "Чарцёж" места Віцебска 1664 года як дакументальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва / В. Краснянскі. Мінск: Інстытут беларускай культуры.,1928. – 55 с.

38. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. / А. М. Кулагін– Мінск: БелЭн, 2001. – 328 с.

39. Левко, О. Н. Витебск: Древние города Беларуси / О.Н. Левко. – Мінск: Беларуская навука, 2010. – 335 с.

40. Левко, О.Н. Витебск XIV–XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск: Наука и техника, 1984. – 120 с.

41. Левко, О.Н. Племенные структуры, погосты и волости Витебского Подвинья / О.Н. Левко. –Ученые записки. Том 2, 2003. – 31–49 с.

42. Никифоровский, Н. Я. Странички из недавней старины города Витебска: Воспоминания старожила (репринт издания 1899 года с комментариями А. М. Подлипского). / Н.Я. Никифоровский – Мінск.: Полымя, 1995. – 149 с.

43. Нікіцін, Г.А. Віцебск / Г.А. Нікіцін. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1959. — 112 с.

44. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год. / под редакцией А.М. Сементовского. —С.–Петербург:Типография К.Вульфа, 1864. — 523 с.

45. Памятная книжка Витебской губернии на 1878 год. / под редакцией А.М. Сементовского.— Витебск: В типографии Витебского Губернского Правления, 1878. — 414 с.

46. Памятная книжка Витебской губернии на 1881 год. / Издание Витебского Губернского Статистического комитета— Витебск: Типография Витебского Губернского Правления, 1881. —379 с.

47. Памятная книжка Витебской губернии на 1905 год Витебск: / Издание Витебского Губернского Статистического комитета— Витебск: Губернская Типо–литография. 1904. — 478 с.

48. Памятная книжка Витебской губернии на 1908 год Витебск: / Издание Витебского Губернского Статистического комитета— Витебск: Губернская Типография, 1908. — 559 с.

49. Памяць: Гіст.–дакументальная хроніка Віцебска. У 2–х кн. Кн. 1–я / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – 648 с.

50. Подллипский, М. А. Памятные места Витебщины. / М. А. Подллипский– Мн.: Беларусь. 1987. – 48 с.

51. Полное собрание русских летописей. Том 32. Хроники: Литовская и Жмойтская, Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного.— М.: Наука, 1975.— 234 с.

52. Полное собрание русских летописей. Том 35. Летописи белорусско–литовские. — М.: Наука, 1980. — 306 с.

53. Рахманько, В. Г. Железная дорога Беларуси: История и современность / В. Г. Рахманько. – Мн.: ОДО «Триолета», 2001. – 488 с.

54. Русецкий, А. В. Архитектура и градостроительство в художественной культуре Витебщины. С 1918 года и до наших дней / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий. — Витебск : УО "ВГУ им. П. М. Машерова", 2011. — 180 с.

55. Сапунов, А.П. Витебская старина / А.П. Сапунов. – Витебск: Типография губернского правления, 1883. – 669 с.

56. Сапунов, А.П. Река Западная Двина. Историко–географический обзор / А.П. Сапунов. – Витебск: Типо–Литография Г.А. Мадкина, 1893. — 521 с.

57. Сапунов, А.П. «Чертеж» гор. Витебска 1664 года / А.П. Сапунов. – Витебск : Тип. насл. М.Б. Неймана, 1910. – 30 с.

58. Сементовский, А.М. Белорусские древности / А.М. Сементовский. — СПб.: Типо–литография Н. Стефанова, 1890. —137 с.

59. Тишкин, И.А. Витебские замки / И.А. Тишкин.– Витебск.: Государственное учреждение "Центр культуры "Витебск", 2013. – 20 с.

60. Ткачев, М.А. Замки Белоруссии / М.А. Ткачев. – Минск: Полымя, 1987. – 222 с.

61. Ткачоў, М. Раскопкі на Верхнім замку / М. Ткачоў, Л. Калядзінскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1984. – № 1. – 29 с.

62. Трусаў, А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI – XVIII стагоддзяў. Гісторыя будаўнічай тэхнікі. – Мн.: Лекцыя, 2001. – 133 с.
63. Чантурия, Ю.В. Градостроительное искусство Беларуси. / Чантурия Ю.В. Мн.: Белорусская наука, 2005.– 375 с.
64. Чарняўская, Т. І. Архітэктура Віцебска: З гісторыі і планіроўкі забудовы горада/ Т.І. Чарняўская –Мінск.: Навука і тэхніка, 1980. – 112 с.
65. Шадыра, В.І. Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н.э.)/В.І.Шадыра – Мінск: ДНУ "Інстытут гісторіі НАН Беларусі", 2006. – 150 с.
66. Шамрук, А.А. Архитектура Беларуси XX – начала XXI в. Эволюция стилей и художественных концепций / А.А.Шамрук. – Минск, 2007. – 135 с.
67. Штыхаў, Г. В. Археолагі дапаўняюць летапісцаў / Г. В. Штыхаў. – Мн.: Беларуская навука, 2009. – 149 с.
68. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1978.— 160 с.
69. Шчакаціхін, М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Мінск. Навука і тэхніка, 1993. – 333 с.
70. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 2.: Беліцк — Гімн / Рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. — Мн.: БелЭн, 1994. — 537 с.
71. Электорнная беларуская бібліятэка [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://knihi.com.– Дата доступа: 20.12.2016.
72. Якимович, Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII вв. / Ю.А. Якимович. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 366 с.